**Млявы** Сцяпан Пятровіч // Памяць. Чашніцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: М. Ц. Дробыш [і інш.] ; уклад. Н. Т. Кіндзяева ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Беларуская навука, 1997. — С. 466.

**МЛЯВЫ СЦЯПАН ПЯТРОВІЧ**

Нарадзіўся 18 кастрычніка 1949 г. у г. Чашнікі. Беларус. Член КПСС. Маці, Вольга Філімонаўна, і бацька, Пётр Андрэевіч, пенсіянеры. У 1971 г. С. П. Млявы скончыў Чалябінскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча штурманаў. Служыў у Прыкарпацкай, Забайкальскай і Ленінградскай ваенных акругах. У 1984 г. накіраваны ў Афганістан. З 10 снежня 1984 г. да 14 сакавіка 1985 г. ажыццявіў 117 баявых вылетаў. Капітан С. П. Млявы загінуў 14 сакавіка 1985 г. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі «60 гадоў Узброеных Сіл СССР», «За бездакорную службу» III ступені. У С. П. Млявага расце сын Андрэй, які разам з маці, Галінай Мікалаеўнай, жыве ў Мінску.